да при всех их идеологических разногласиях рассматривают демократию как политическую конструкцию, призванную воплотить во власти совокупность совершенно определенных идеалов и принципов – свободу, равенство, справедливость, т. е. тех высших ценностей, которые и выражают ее социальный смысл и предназначение.

Приверженцам такого предзаданного ценностями понимания демократии оппонировали сторонники рационально-процедурного подхода. Общетеоретическая основа такой позиции базируется на том, что демократия возможна лишь в условиях, когда распространение ресурсов власти в обществе приобретает столь широкий характер, что ни одна общественная группа не в состоянии подавить своих соперников или сохранить властную гегемонию. В таком случае наиболее рациональным выходом из ситуации является достижение компромисса и взаимное разделение функций и полномочий, обусловливаемых чередованием групп у власти. Эти-то процедуры и технологии установления подобного порядка и выражают существо демократической политики.

На разных этапах либерального государствоведения в зависимости от конкретно-исторических обстоятельств выдвигались то апологеты нормативных приоритетов, то защитники рационалистических процедур. Наиболее же типичным подходом либеральных теоретиков было стремление соединить противостоящие системы аргументации в единую на основе учета специфики российской действительности.

В совокупности своих философско-методологических, общетеоретических и программно-практических установок, понятий и целей российская юридическая школа, таким образом, представила эталон развитого политического знания и воплотила институционализированное (избрав в качестве объекта анализа – государство) направление в становлении российской политологии.

[1] Мощелков Е.Н. Десять веков политической мысли в России // Политическая мысль в России: Словарь персоналий (XI в. – 1917 г.). М., 2000. С. 5.

[2] См.: Медушевский А.Н. Демократия и авторитаризм: Российский конституционализм в сравнительной перспективе. М., 1997.

[3] Разрабатывая учение о государстве, либеральные государствоведы внесли свой вклад и в становление общесоциологической теории, о чем свидетельствуют оценки специалистов – историков российской социологии. См.: Кареев Н.И. Основы русской социологии. СПб., 1996. С. 111–151; Миненков Г.Я. Введение в историю российской социологии. Мн., 2000. С. 234.

***Решетников Сергей Васильевич*** – доктор политических наук, профессор, директор Института государственного управления Академии управления при Президенте Республики Беларусь.

***Ватыль Виктор Николаевич*** – кандидат философских наук, доцент кафедры теории и истории государства и права юридического факультета Гродненского государственного университета им. Я. Купалы.

*В.М. ЦЫНКЕВІЧ*

## ПЫТАННЕ СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МЕНШАСЦІ У ПОЛЬШЧЫ НА МІЖНАРОДНАЙ АРЭНЕ У 1921–1939 гг.

Уключэнне значнай часткі зямель, населеных беларусамі, у склад Польшчы паводле Рыжскага міру было прызнана дзяржавамі Антанты ў 1923 г., калі Канферэнцыя паслоў Вялікабрытаніі, Францыі, Італіі і Японіі вызначыла ўсходнія граніцы Польшчы (з Літвой і СССР). Ні ў адным з міжнародных дагавораў, заключаных Польшчай, заходнія беларускія землі не разглядаліся як асобная геаграфічная ці адміністрацыйная адзінка, якой павінны быць нададзены правы, адрозныя ад іншай тэрыторыі Польшчы.

Правы беларусаў як нацыянальнай меншасці ў складзе Польшчы гарантаваліся некалькімі міжнароднымі дамовамі, у прыватнасці Парыжскім



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

(1919) і Рыжскім (1921) дагаворамі. Гэта праблема неаднаразова узнімалася у час спроб вырашэння пытання прыналежнасці Віленшчыны – тэрыторыі, на якую прэтэндавалі Польшча і Літва. Рэпрэсіі польскіх улад супраць беларускага руху набывалі водгук у краінах Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі.

28 чэрвеня 1919 г. у Версалі быў падпісаны мірны дагавор з Германіяй, якім дзяржавы Антанты вызначылі новы ўклад свету пасля разгрому краін Траістага саюза. Як састаўная частка Версальскіх умоў быў падпісаны «Трактат паміж галоўнымі саюзнымі дзяржавамі і Польшчай», ці так званы «малы версальскі трактат», згодна з якім Польшча абавязвалася абараняць жыццё і свабоды усіх грамадзян без уліку месца нараджэння, нацыянальнасці, расы ці мовы (арт. 2), меншасцям гарантаваліся правы свабоднага заснавання дабрачынных, культурных, рэлігійных установ, школ, свабоднае ўжыванне роднай мовы (арт. 8). Паводле артыкула 12 гэтыя правы знаходзіліся пад гарантыяй Лігі Нацый, і Польшча згаджалася на тое, каб кожны член Рады Лігі меў права звяртаць увагу Рады на парушэнне ці пагрозу парушэння Польшчай сваіх абавязкаў, пасля чаго Рада магла паступаць такім чынам і даваць такія рэкамендацыі, якія палічыць неабходнымі ў кожным дадзеным выпадку. Калі ж урад Польшчы не выканае рэкамендацый Рады, пытанне магло быць перададзена на разгляд Сталага міжнароднага трыбунала справядлівасці ў Гаазе[1]. Спецыяльныя дагаворы па ахове правоў меншасцей былі заключаны дзяржавамі Антанты таксама з Чэхаславакіяй, Югаславіяй, Румыніяй і Грэцыяй.

Парадак разгляду скаргаў удакладняўся на працягу 1920–1925 гг. У 1920 г. было вызначана, што петыцыі разглядаюцца камітэтам трох, які складаецца са Старшыні Рады і двух яе членаў. У 1923 г. былі вызначаны дапушчальныя формы петыцый: яны не павінны змяшчаць патрабаванняў ліквідацыі палітычных адносін між дзяржавай і меншасцю, быць карэктнымі, падпісвацца кіраўнікамі вядомых арганізацый, факты павінны лёгка правярацца, не паўтарацца. Камітэт трох пасля падрыхтоўкі матэрыялаў Сакратарыятам Лігі Нацый (камісіяй адміністрацыйных спраў і меншасцей) разглядаў скаргу з галоўнай мэтай прымірыць абодва бакі. У адваротным выпадку яна выносілася на разгляд Рады[2]. З 1926 г., калі Германія стала членам Лігі Нацый і яе Рады, яна змагла выносіць пытанне парушэння правоў меншасцей непасрэдна на разгляд Рады. Гэтай магчымасці не мелі Літва (бо не з'яўлялася членам Рады), а таксама беларускія і ўкраінскія арганізацыі, якія маглі толькі падаваць петыцыі ў Сакратарыят. Акрамя таго, інфармацыя аб становішчы нацменшасцей паступала ў Лігу Нацый праз Міжнародны саюз таварыстваў Лігі Нацый (аб становішчы ўкраінцаў, яўрэяў, немцаў у Польшчы), спецыяльную камісію этнічных і каланіяльных спраў меў Міжпарламенцкі саюз[3].

Паводле падлікаў польскага даследчыка С. Сярпоўскага, у 1921–1939 гг. у Лігу Нацый паступілі 883 петыцыі аб парушэннях правоў нацыянальных меншасцей, з іх 488 не было прынята да разгляду з-за няправільнага афармлення, большасць астатніх залагоджана на папярэдніх ступенях. І толькі некалькі дзясяткаў дайшло да разгляду Радай[4]. Польшча была на першым месцы сярод абскарджаных краін, толькі ў 1920–1930 гг. на яе было пададзена 155 скаргаў[5].

Беларускія арганізацыі Польшчы неаднаразова спрабавалі звярнуць увагу Лігі Нацый на парушэнні правоў беларусаў у Польшчы. Рэзалюцыя з'езда нацменшасцей Польшчы і мемарандумы асобных нацыянальных груп у 1923 г. былі перададзены Лізе Нацый[6]. Фракцыя польскага сейма «Беларускі пасольскі клуб» 15 жніўня 1929 г. падала мемарыял у Лігу Нацый са скаргай на проціпраўныя дзеянні польскіх улад у адносінах да нацыянальных меншасцей[7]. У 1930 г. аналагічны мемарыял быў надрукаваны ў Вільні,



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

але польскія улады канфіскавалі увесь тыраж[8]. Заходнебеларуская газета «Вольны сцяг» 28 верасня 1923 г. нават змясціла артыкул «Як падаваць скаргі у Лігу Народау», дзе пераказала змест адпаведнай рэзалюцыі Лігі Нацый.

Скаргі, высланыя беларускімі арганізацыямі, а таксама Радай і Урадам БНР, ніколі не разглядаліся Радай Лігі Нацый. Ніводная з іх нават не была вынесена на разгляд камітэта трох, што можна растлумачыць як дрэннай падрыхтоўкай саміх скаргаў, так і адсутнасцю ў Лізе абаронцы правоў беларускай меншасці ў Польшчы. Перспектыва ўваходжання СССР у Лігу Нацый і магчымасць абароны ім правоў беларусаў і украінцаў сталі адной з прычын разрыву Польшчай дагавора аб ахове правоў меншасцей, хаця гэты крок рыхтаваўся польскай дыпламатыяй з 1931 г.[9] Яшчэ 10 красавіка 1934 г. польскі прадстаўнік у Лізе Нацый зрабіў прапанову распаўсюдзіць абавязкі абароны правоў нацыянальных меншасцей на усе дзяржавы, але ніхто яго не падтрымаў. У час абмеркавання пытання ўваходжання СССР у Лігу міністр замежных спраў Польшчы С. Бек зрабіў заяву аб спыненні Польшчай супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі ў галіне аховы правоў меншасцей да распаўсюджання яе на ўсе краіны на той падставе, што унутранае заканадаўства Польшчы дастаткова абараняе гэтыя правы[10].

Зазначым, што савецкая дыпламатыя за ўвесь час знаходжання у Лізе Нацый ні разу не ўздымала пытання парушэння правоў беларусаў і украінцаў у Польшчы.

Савецкі Саюз як правапераемнік дагавора РСФСР і УССР з Польшчай 18 сакавіка 1921 г. меў магчымасць абараніць правы асоб рускай, украінскай і беларускай нацыянальнасцей у Польшчы на падставе арт. VII Рыжскага дагавора, паводле якога Польшча абавязвалася надаваць ім усе правы, забяспечваючы свабоднае развіццё культуры, мовы і выкананне рэлігійных абрадаў. Беларусы, рускія і ўкраінцы атрымалі магчымасць адкрываць нацыянальныя школы, ствараць саюзы і арганізацыі для развіцця сваёй культуры. Аналагічнымі правамі карысталіся і палякі на тэрыторыі Беларусі, Расіі і Украіны.

Цікава, што артыкул быў унесены ў дагавор па ініцыятыве польскага боку, які меркаваў на яго падставе мець права абароны палякаў у савецкіх рэспубліках[11], але ім больш актыўна карысталася савецкая старана.

БССР як незалежная дзяржава ўжыла толькі аднойчы магчымасць абароны правоў беларускай меншасці ў Польшчы. Старшыня Савета народных камісараў і нарком замежных спраў А. Чарвякоў накіраваў ноту 21 жніўня 1921 г. міністру замежных спраў Польшчы К. Скірмунту, у якой адзначалася, што мясцовыя польскія улады закрылі 148 беларускіх школ і забаранілі адкрываць новыя, ствараць кааператывы і таварыствы ўзаемадапамогі, канфіскуюць на пошце беларускія выданні, пагражаюць іх чытачам расправай. Урад БССР лічыў, што гэта робіцца без ведама польскага ўрада і спадзяваўся на выпраўленне становішча у адпаведнасці з арт. VII Рыжскага дагавора. У сваю чаргу, беларускі урад запэўніваў, што захавае ўсе правы польскай меншасці ў БССР[12].

Адзначым, што ў ноце яскрава праявілася пазіцыя адносін Польшчы да беларускіх зямель як да тэрыторыі «Заходняй Беларусі, якая перайшла да Польскай Рэспублікі», гэта значыць, што кіраўніцтва БССР адносілася да іх не столькі як да адной з частак Польшчы, колькі як да беларускіх зямель, што апынуліся ў складзе суседняй дзяржавы, што, у сваю чаргу, не задавальняла польскія ўлады. У ноце неканкрэтна выкладаліся факты парушэння правоў беларусаў, прычым многія з іх адбыліся на тэрыторыі Сярэдняй Літвы (у ноце – «Віленская акруга»), фармальна незалежнай ад Польшчы. Паказальным з'яўляецца момант, калі Польшча палічыла не абвяргаць прыведзеныя факты, як неаднаразова рабіла з нотамі Савецкай Расіі, а ўвогуле не адказваць на беларускую ноту.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Нагадаем некаторыя падзеі згаданага выступлення БССР. Беларускія ўлады накіравалі 28 чэрвеня 1921 г. у НКЗС РСФСР тэлеграму з просьбай звярнуць увагу ўрада Польшчы на парушэнні правоў беларусаў у Заходняй Беларусі з іх пералікам[13]. У адказ НКЗС адзначыў, што «з-за таго, што указаныя вамі выпадкі датычацца парушэння правоў Беларускай Рэспублікі, Наркамзамспраў лічыць мэтазгодным, каб нота пратэста зыходзіла ад урада Беларускай Рэспублікі», і прасіў толькі выслаць у яго адрас копію ноты[14]. Гэты ж пункт гледжання выказаў 3 ліпеня ў тэлеграме А.Р. Чарвякову і нарком замежных спраў РСФСР Г.В. Чычэрын. Падрыхтоўка праекта ноты была даручана намесніку наркомзамспраў БССР А.Л. Бурбісу. Але ўжо пасля высылкі ноты беларускі НКЗС быў вымушаны апраўдвацца за занадта мяккі тон ноты, якім быў незадаволены НКЗС РСФСР. А.Л. Бурбіс пісаў Г.В. Чычэрыну, што «мяккі тон ноты выкліканы перш за усё нежаданнем абвастраць адносіны Савецкіх Рэспублік з Польшчай, таксама недастатковым з фармальнага боку абаснаваннем ноты (у большасці звесткі з замежных газет), а таксама тым, што ёю было закранута пытанне аб кааператывах, якое магло бы кваліфікавацца палякамі як умяшальніцтва ва ўнутраныя справы». У лісце таксама паведамлялася, што беларускі бок рыхтуе «больш цвёрдую» ноту аб бандытызме[15]. Дарэчы, яна так і не была паслана.

Пытанне становішча беларусаў у Польшчы, акрамя таго, абмяркоўвалася падчас сустрэчы паўнамоцнага прадстаўніка БССР пры ўрадзе РСФСР М.І. Мароза з паверанным у справах Польшчы ў РСФСР Т. Філіповічам, прычым польскі прадстаўнік імкнуўся запэўніць, што яго ўрад не мае намеру перашкаджаць развіццю беларускага руху. Гэтая ж праблема закранала у ноце ўрада РСФСР 22 ліпеня 1922 г.

Савецкімі рэспублікамі і СССР пытанне становішча беларусаў і ўкраінцаў у Польшчы ўздымалася неаднаразова, але найбольш востра – у 1924 г., калі 10 мая нарком замежных спраў СССР Г.В. Чычэрын у ноце кіраўніку польскай місіі ў Маскве Л. Дароўскаму выклаў спіс парушэнняў арт. VII Рыжскага дагавора. Акрамя парушэння права на асвету, закрыцця школ і газет на беларускай мове, канфіскацыі кніг, збіцця сялян салдатамі і жандарамі, прадстаўнік СССР крытыкаваў праявы парушэння свабоды выбараў і закрыццё праваслаўных цэркваў[16]. У адказ Польшча абвінаваціла СССР ва ўмяшальніцтве ва ўнутраныя справы. Палеміка не прывяла да змены стану рэчаў і скончылася пасля яшчэ аднаго абмену нотамі ў канцы 1924 г.

Цікава, што паралельна з нотай актывізаваліся выступленні беларускіх і ўкраінскіх дэпутатаў у польскім сейме. У сваім дзённіку вядомы тагачасны польскі палітычны дзеяч М. Ратай звязвае гэтыя падзеі[17]. Практычна адначасова ноту аб парушэнні правоў нямецкай меншасці ў Польшчы падала і Германія[18]. Магчыма, гэта сумеснае выступленне падштурхнула польскі ўрад да спробы рэформ у галіне асветы нацыянальных меншасцей у 1924 г.

У далейшым на дыпламатычным узроўні праблема не абмяркоўвалася. На наш погляд, гэта можна растлумачыць тым, што савецкія ўлады ўсведамлялі бессэнсоўнасць прамога дыпламатычнага ціску на Польшчу ў сітуацыі, калі ў адказ польскія ўлады маглі абвінаваціць савецкія ў тых жа «грахах» – закрыцці касцёлаў, канфіскацыі касцёльных каштоўнасцей, арыштах прадстаўнікоў польскіх арганізацый, немагчымасці свабоднага ўдзелу ў выбарах і выданні прэсы. Палякі па тых самых прычынах не маглі ўздымаць пытанне становішча польскай меншасці ў СССР. Як адзначае В. Побург-Маліноўскі, калі ў СССР у сярэдзіне 1920-х гг. адбываліся арышты ксяндзоў, Польшча вымушана была дзейнічаць праз Ватыкан, а не наўпрост, бо сама праводзіла рэпрэсіі супраць беларускага насельніцтва[19]. Праблема абароны правоў беларусаў і ўкраінцаў Польшчы ўвогуле не была вызначальнай у польска-савецкіх адносінах, яна не згадвалася ў час перагавораў Г.В. Чычэрына ў Варшаве ў 1922 і 1925 гг. і В. Копа ў 1923 г. У тэлеграме паўпрэда СССР у Польшчы П.Л. Войкава ў Маскву ад 18 снежня



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

1925 г. адзначалася, што пытанне аб пацвярджэнні Польшчай абавязкаў Рыжскага дагавора аб нацыянальных меншасцях у будучым савецка-польскім палітычным дагаворы разглядаецца толькі як прадмет гандлю[20].

«Узамен» СССР засяродзіў асноўную ўвагу на падрыхтоўцы рэвалюцыі ў Польшчы, прычым у Заходняй Беларусі яна вялася ў 1920-я гг. пад лозунгам уз'яднання з БССР у адзіную сацыялістычную рэспубліку. Факты парушэння правоў беларусаў у Польшчы шырока ужываліся савецкай прэсай, афіцыйнымі уладамі, але толькі ўнутры краіны. Варта нагадаць, што ў 1920-я гг. – у перыяд найбольшага ўздыму беларускага руху ў Польшчы – СССР толькі пачаў выходзіць з міжнароднай ізаляцыі і не меў магчымасці націску на Польшчу праз сістэму міжнародных арганізацый і дагавораў.

На міжнароднай арэне пытанне становішча беларускай меншасці у Польшчы ўзнімалася ў асноўным беларускімі арганізацыямі Заходняй Беларусі і беларускай эміграцыі і органамі БНР.

У кастрычніку 1925 г. па ініцыятыве арганізацый нямецкіх меншасцей у Жэневе быў праведзены першы кангрэс нацыянальных меншасцей Еўропы, у якім удзельнічаў Ф.М. Ярэміч, старшыня Беларускага пасольскага клуба ў польскім сейме[21]. Беларускія і ўкраінскія прадстаўнікі на ім прапанавалі ўключыць у праграмныя дакументы палажэнні па кожнай нацыянальнай групе і пытанне аб самавызначэнні народаў, што не было падтрымана кангрэсам, які вынес рэзалюцыю з падтрымкай нацыянальна-культурнай аўтаноміі і лаяльнасці да дзяржавы, у якой пражывае нацыянальная група. Кангрэсы праводзіліся і пазней (да 1936 г.), але іх значэнне падала у асноўным з-за супрацьстаяння ў краінах Еўропы арганізацый нямецкіх меншасцей з яўрэйскімі і польскімі[22]. Беларускі нацыянальны камітэт перыядычна высылаў матэрыялы аб становішчы беларусаў у Польшчы ў сакратарыят кангрэсаў. Для ўдзелу ў іх некалькі разоў накіроўваўся дэлегат ад беларускай меншасці Польшчы[23]. Акрамя таго, 24 жніўня 1924 г. у Парыжы быў створаны Камітэт паняволеных Польшчай народаў у складзе прадстаўнікоў украінскай, беларускай і літоўскай меншасцей (ад беларусаў дэлегатам быў В.Ю. Ластоўскі). Камітэт не адыграў такой значнай ролі, як кангрэсы нацменшасцей, але ўсё ж актыўна праводзіў антыпольскую прапаганду. Так, у 1924 г. французскія газеты на падставе матэрыялаў Камітэта змясцілі шэраг артыкулаў аб цяжкім становішчы нацменшасцей у Польшчы[24].

Выкарыстаць міжнародную арэну актыўна спрабавалі беларускія эміграцыйныя арганізацыі, у тым ліку структуры БНР. Гэта імкненне ў пачатку 1920-х гг. выкарысталі ў сваіх мэтах літоўскія ўлады, якія, абгрунтоўваючы прэтэнзіі на Віленшчыну, заяўлялі аб жаданні мясцовага жыхарства (беларусаў) увайсці ў склад Літвы і непрыняцці імі польскай улады. У 1921 г. паміж Літоўскай Рэспублікай і БНР быў заключаны тайны антыпольскі саюзны дагавор, скасаваны літоўскім бокам у 1924 г, які ў той час лалічыў беларускі рух занадта слабым для эфектыўнага ўздзеяння на Польшчу. На міжнароднай арэне падтрымка Літвы праявілася ў час польска-літоўскіх перагавораў пад эгідай Лігі Нацый у Бруселі ў 1921 г., калі В.Ю. Ластоўскі і А. Цвікевіч ад імя ўрада БНР выказаліся за перадачу спрэчных зямель Літве пры ўмове выдзялення іх у асобую палітычную адзінку, звязаную з Літвой асобным дагаворам[25]. Літоўскія ўлады дзеля ўласных інтарэсаў не толькі фінансавалі (з дапамогай Германіі) структуры БНР, беларускія арганізацыі ў Літве і партызанскі рух у Заходняй Беларусі[26], але і ўздымалі пытанне становішча беларусаў у Польшчы ў Лізе Нацый (7 лютага 1922 г. – скарга аб высылцы з Польшчы беларускіх і літоўскіх палітычных дзеячаў)[27].

Шматлікія самастойныя выступленні БНР на міжнароднай арэне: пратэсты ў Лігу Нацый супраць падзелу беларускіх зямель у Рызе (16.12.1920), аб становішчы ў Беларусі (18.12.1920), супраць арганізацыі асадніцтва ў Заходняй Беларусі (15.01.1921), мемарандум Папе Рымскаму аб неабход-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

насці увядзення беларускай мовы ў касцёлах (07.02.1921), пратэст «усяму культурнаму свету» (15.03.1921) супраць Рыжскага мірнага дагавора, пратэст у Лігу Нацый (06.06.1921) супраць прэтэнзіі Польшчы на Віленшчыну і Гродзеншчыну, мемарандумы да канферэнцыі ў Вашынгтоне і Генуі, мемарыял П. Крэчэўскага да Лігі Нацый летам 1922 г. аб адмаўленні беларускага народа ад супрацоўніцтва з Польшчай, заява Рады БНР Старшыні Лігі Нацый у 1924 г. аб тым, што польска-літоўскую спрэчку за Віленшчыну нельга разглядаць без удзелу беларускіх прадстаўнікоў, і многія іншыя выступленні не мелі ніякіх наступстваў, бо урад БНР не быў прызнаны міжнароднай супольнасцю. Асобныя самастойныя выступленні беларускіх дзеячаў, як, напрыклад, «Мемарыял у справе беларускіх зямель пад Польшчай», які В.Ю. Ластоўскі падаў у Лігу Нацый у верасні 1924 г. ад імя літоўска-беларускага таварыства, дзе гаварылася, што Беларусь жадае быць незалежнай і ў саюзе з Літвой, ішлі насуперак палітыцы кіраўніцтва БНР і выклікалі яго пратэсты, што не дадавала аўтарытэту зваротам у міжнародныя арганізацыі[28]. Да таго ж большасць пратэстаў прымалася, як правіла, ужо пасля прыняцця якога-небудзь рашэння на міжнародным узроўні, а адмена рашэння па пратэсту непрызнанага ўрада была справай малаверагоднай. Так, у сакавіку 1925 г. В.Ю. Ластоўскі, які знаходзіўся ў той час у Рыме як Старшыня сувязі нацыянальна-дзяржаўнага вызвалення Беларусі і былы Старшыня Рады Міністраў БНР (паездка фінансавалася літоўскім урадам) падаў Папе Рымскаму мемарыял ад свайго імя і мемарыял беларускага каталіцкага духавенства ў справе канкардату Польшчы з Ватыканам, пратэстуючы супраць адсутнасці ў ім палажэнняў аб правах нацыянальных меншасцей на навучанне рэлігіі ў школах на роднай мове і ўвядзенні беларускай мовы ў набажэнствы. Зразумела, што ўжо падпісаны 10 лютага 1925 г. канкардат не мог быць адменены з-за пратэсту беларусаў.

Беларускія эмігранты ў Празе актыўна ўздымалі пытанне аб становішчы беларусаў у Польшчы як у самой Чэхаславакіі (на тэрыторыі якой дзякуючы прыхільным адносінам улад дзейнічалі шматлікія арганізацыі украінскіх, рускіх і беларускіх эмігрантаў), так і на міжнародных з'ездах (канферэнцыях Міжнароднай студэнцкай канфедэрацыі, Усеславянскім студэнцкім з'ездзе ў Празе ў 1922 г., з'ездзе славянскай аграрнай моладзі ў Любляне ў 1924 г. і г. д.)[29]. Прадстаўніцтва ўрада БНР у Чэхаславакіі сумесна з украінскімі арганізацыямі выдавала мемарандумы пратэсту супраць польскай палітыкі ў Заходняй Беларусі[30]. Таксама некалькі выступленняў супраць парушэння правоў беларусаў у Польшчы арганізаваў Беларускі нацыянальны камітэт у Чыкага (ЗША)[31].

Як адзначае А.І. Цвікевіч, «ураду БНР так і не давялося дабіцца пастаноўкі беларускага пытання на пленуме Лігі Нацый»[32]. Немагчымасць самастойна супрацьстаяць палітыцы Польшчы, страта падтрымкі Літвы і рост прасавецкіх настрояў былі галоўнымі прычынамі склікання ІІ Усебеларускай канферэнцыі ў Берліне 12–16 кастрычніка 1925 г. У мемарандуме выконваючага абавязкі Старшыні Рады Міністраў А.І. Цвікевіча да ўрада БНР адзначалася, што ўрад змагаўся супраць акупацыі Заходняй Беларусі Польшчай, «але тая магчымасць, якая была ў яго распараджэнні – менавіта, апеляцыя да Сталага міжнароднага трыбунала справядлівасці Лігі Нацый і адпаведная прапаганда ў Еўропе – не далі абсалютна ніякіх вынікаў»[33].

Выступленні БНР вяліся з пазіцыі незалежнай дзяржавы, акупіраванай Польшчай. Гэта яскрава бачна ў дэкларацыі маршалка Рады БНР да Рады Лігі Нацый 18 чэрвеня 1922 г., дзе гаварылася, што «мы, беларусы, катэгарычна адкідаем усякае супрацоўніцтва з палякамі ў форме меншасці ў Польшчы», патрабавалася ануляваць Рыжскі мір, стварыць незалежную Беларускую рэспубліку[34]. Зразумела, што разглядаць катэгарычныя заявы непрызнанай краіны супраць дзяржавы, чыё існаванне, межы і палітыка ў ад-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

носінах да меншасцей былі замацаваны шэрагам міжнародных дагавораў, Ліга Нацый і дзяржавы Антанты не маглі. Скаргі БНР у Лігу Нацый на палітыку Польшчы не разглядаліся, бо яны ў цэлым насілі абстрактна-прапагандысцкі характар, адвяргалі саму правамернасць прыналежнасці заходнебеларускіх зямель да Польшчы і ўздымалі пытанні, што яўна выходзілі за межы кампетэнцыі Лігі Нацый. У гэтым яны ставіліся на адзін узровень з ультыматумамі «атамана Гродзеншчыны» Г. Шыманюка Ю. Пілсудскаму і Лізе Нацый з патрабаваннем неадкладнага прызнання незалежнасці Беларусі[35]. Выступленні БНР значна адрозніваліся ад крокаў украінскага руху, які ў 1922 г. пры ўрадзе ЗУНР стварыў Украінскае таварыства Лігі Нацый, прынятае ў Саюз міжнародных таварыстваў Лігі Нацый[36]. У 1920–1930-я гг. украінцы падалі шэраг зваротаў у Лігу Нацый, якія набылі вялікі рэзананс, асабліва скаргі на падаўленне хваляванняў украінцаў у 1930–1931 гг. (так званыя «пацыфікацыі»), якія разглядаў «камітэт трох» Лігі Нацый[37].

Становішча нацыянальных меншасцей, у тым ліку беларускай, актыўна крытыкавалася Камуністычнай партыяй Польшчы і звязанымі з ёй арганізацыямі. Праз удзел у міжнародных кангрэсах, з'ездах, руху барацьбы за мір пытанне перыядычна выходзіла за межы Польшчы, хоць гэтаму актыўна супрацьдзейнічалі польскія ўлады. Беларускае пытанне ўздымалася на міжнароднай сялянскай канферэнцыі ў Берліне ў ліпені 1929 г. (удзельнічаў І. Дварчанін), на Еўрапейскім сялянскім кангрэсе ў Берліне ў 1930 г. (удзельнічаў Б. Тарашкевіч), на Еўрапейскім антыфашысцкім кангрэсе ў 1933 г. у Парыжы (удзельнічалі П. Крынчык і С. Лазарчык). Арганізацыі Міжнароднай арганізацыі дапамогі рэвалюцыянерам у Канадзе, Францыі, Аргенціне, ЗША бралі шэфства над палітзняволенымі Заходняй Беларусі, камуністы заходніх краін праводзілі мітынгі ў абарону нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі. Так, у Берліне ў 1931 г. быў арганізаваны мітынг працоўных супраць акупацыі Заходняй Беларусі[38].

Супраць парушэнняў правоў беларусаў у Польшчы пратэставалі ў розных краінах Еўропы і ў ЗША ў 1927–1928 гг. у сувязі з разгромам Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Мітынгі адбыліся ў Парыжы, Празе, Нью-Йорку, Чыкага[39], а таксама ў пачатку 1930-х гг. – у сувязі з арыштамі беларускіх дэпутатаў польскага сейма (фракцыі «Змаганне») і актывістаў Таварыства беларускай школы.

Падсумоўваючы выкладзенае, можна пагадзіцца з аўтарамі «Гісторыі польскай дыпламатыі», якія сцвярджаюць, што беларускае пытанне не мела такой вастрыні для польскай знешняй палітыкі, як, напрыклад, літоўскае, перш за ўсё з-за слабасці беларускага руху[40]. У разгледжаны перыяд яно проста не набыло статуса міжнароднай праблемы. У адрозненне, напрыклад, ад Усходняй Галіцыі Заходняя Беларусь не разглядалася міжнароднай супольнасцю як асобная адміністрацыйная, нацыянальная ці тэрытарыяльная адзінка. Нават у спрэчцы за Віленскі край, якую вялі Польшча і Літва, уцягнуўшы Лігу Нацый і Антанту, беларускае пытанне згадвалася бакамі толькі пры абгрунтаванні сваіх прэтэнзій на тэрыторыю, населеную беларусамі. Пытанне Заходняй Беларусі праяўлялася на міжнароднай арэне пераважна ў форме пратэстаў супраць парушэння польскімі ўладамі правоў беларускай нацыянальнай меншасці.

[1] Гл.: Prawo miedzynarodowe i historia dyplomatyczna: Wybor dokumentow / Wstep i opracowanie L. Gelberga. Warszawa, 1958. T. 2. S. 62–71.

[2] Гл.: Zarnowski J. Polska a miedzynarodowy system ochrony mniejszosci. 1919–1934 // Studia z najnowszej historii Niemiec i stosunkow polsko-niemieckich. Poznan, 1986. S. 221.

[3] Гл.: Kierski K. Ochrona praw mniejszosci w Polsce. Poznan, 1933. S. 446.

[4] Гл.: Sierpowski S. Mniejszosci narodowe jako instrument polityki miedzynarodowej. 1919–1939. Poznan, 1986. S. 72.

[5] Гл.: Polska odrodzona. 1918–1939. Panstwo – Spoleczenstwo – Kultura / Pod red. J. Tomickiego. Warszawa, 1982. S. 343.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

[6] Гл.: Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Вільня; Нью-Ёрк; Менск; Прага, 1998. Т. 1. Кн. 2. С. 1443.
[7] Гл.: Шлях моладзі. 1929. № 7. С. 14.
[8] Гл.: Шлях моладзі. 1930. № 6. С. 16.
[9] Гл.: Михутина Н.В. Советско-польские отношения. 1931–1935. М., 1977. С. 32.
[10] Гл.: Historia Dyplomacji polskiej. Warszawa, 1995. Т. IV: 1918–1939. S. 473.
[11] Гл.: Iwanow M.I. Pierwszy narod ukarany. Polacy w Zwiazku Radzieckim. 1921–1939. Warszawa; Wroclaw, 1991. S. 243.
[12] Гл.: Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Мн., 1997. Т. 1 (1917–1922 гг.). С. 276–277.
[13] Гл.: Бягучы архіў Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь (далей – Бягучы архіў МЗС РБ). Фонд НКИД БССР. Воп. 4. Спр. 2. Л. 48.
[14] Гл.: Там жа. Фонд НКИД БССР. Воп. 4. Спр. 2. Л. 53.
[15] Гл.: Там жа. Фонд НКИД БССР. Воп. 4. Спр. 2. Л. 83.
[16] Гл.: Знешняя палітыка Беларусі. Указ. тв. 1999. Т. 2 (1923–1927 гг.). С. 98–104.
[17] Гл.: Rataj M. Pamietniki. Warszawa, 1965. S. 200.
[18] Гл.: Мезга Н. Н. Политика Рапалло и польско-советские отношения в 1922–1926 годах: Дис. ... канд. ист. наук: 07.00.03. Мн., 1996. С. 64.
[19] Гл.: Pobog-Malinowski W. Najnowsza historia polityczna Polski. 1864–1945. Londyn, 1956. T. II: 1919–1939. Czesc I. S. 428.
[20] Гл.: Мезга М. Пытанне абароны правоў нацыянальных меншасцяў у савецкай палітыцы адносна Польшчы у першыя гады пасля Рыжскага міру // Нацыянальныя меншасці Беларусі. Брэст; Мінск; Віцебск, 1996. Кн. II. С. 53.
[21] Гл.: Іскра. 1925. 14 кастр. С. 2.
[22] Гл.: Sierpowski S. Указ. тв. S. 31.
[23] Гл.: Stankievic A. Bielaruski chryscijanski ruch. Vilnia, 1939. S. 226; Снапкоўскі У. Эміграцыя // Полымя. 1995. № 11. С. 213.
[24] Гл.: Вабішчэвіч А. Вацлаў Ластоўскі і нацыянальная школа у Заходняй Беларусі (1920-я гады) // Беларусіка. Мн., 1995. Вып. 4. С. 284.
[25] Гл.: Знешняя палітыка Беларусі. Указ. тв. 1997. Т. 1 (1917–1922 гг.). С. 261.
[26] Гл.: Коукель І. Польска-літоўскі канфлікт і роля у ім беларускіх палітычных партыяў і арганізацыяў (1920–1923 гг.) // Беларусіка. Мн., 1994. Вып. 3. С. 259–269.
[27] Гл.: Lossowski P. Po tej i tamtej stronie Niemna. Stosunki polsko-litewskie. 1883–1939. Warszawa, 1985. S. 201.
[28] Гл.: Янушкевіч Я. Незалежнік // Спадчына. 1993. № 5. С. 42.
[29] Гл.: Клімовіч А. Беларускае студэнцтва у жыцьці міжнародным // Студэнцкая думка. 1928. № 1. С. 18–21.
[30] Гл.: Справа Вацлава Ластоўскага // Маладосць. 1993. № 8. С. 223.
[31] Гл.: Знешняя палітыка Беларусі. Указ. тв. 1999. Т. 2 (1923–1927 гг.). С. 45.
[32] Цвікевіч А. Бэрлінская конфэрэнцыя // Полымя. 1926. № 4. С. 85.
[33] За дзяржаўную незалежнасць Беларусі. Лондан, 1960. С. 69.
[34] Гл.: Беларускі сцяг. 1922. № 4. С. 44–45.
[35] Гл.: Заходняя Беларусь. Мн., 1925. С. 53.
[36] Гл.: Zaks Z. Sprawa Galicji Wschodniej w Lidze Narodow (1920–1922) // Najnowsze dzieje Polski. Materialy z okresu 1914–1939. Warszawa, 1967. T. XII. S. 151.
[37] Гл.: Werschler I. Z dziejow obozu belwederskiego. Tadeusz Holowko. Zycie i dzialalnosc. Warszawa, 1984. S. 297.
[38] Гл.: Воткович Г. В. КПЗБ в борьбе за интернациональное единство трудящихся. Мн., 1975. С. 49.
[39] Гл.: Палуян У.А. Беларуская сялянска-работніцкая грамада. Мн., 1967. С. 201.
[40] Гл.: Historia Dyplomacji polskiej. Указ. тв. S. 97.

***Цынкевіч Валерый Міхайлавіч*** – другі сакратар консульскага ўпраўлення Міністэрства замежных спраў, аспірант-завочнік. Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар М.Э. Часноўскі.

This document has been edited with Infix PDF Editor
- free for non-commercial use.
To remove this notice, visit:
www.iceni.com/unlock.htm